ДЗЯРЖАЎНАЯ ЎСТАНОВА АДУКАЦЫІ
«МІНСКІ АБЛАСНЫ ІНСТЫТУТ РАЗВІЦЦЯ АДУКАЦЫІ»
ЦЭНТР МЕДЫЯРЭСУРСАЎ І БІБЛІЯТЭЧНАЙ РАБОТЫ

АДУКАЦЫЯ МІНСКАЙ ВОБЛАСЦІ

Ў РЭСПУБЛІКАНСКІХ І АБЛАСНЫХ СМІ

Беларусь сегодня

Настаўніцкая газета

Родная газета на роднай мове
ЗВЯЗДА

Рэспубліка

НАРОДНАЯ ГАЗЕТА

МІНСКАЯ ПРАЎДА

«Звязда» – грамадска-палітычная беларускамоўная газета.

Выдаецца з 27 ліпеня (9 жніўня) 1917 г. Выходзіць пяць разоў на тыдзень.

Заснавальнікі: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Выдавец: Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

Web-сайт: http://zviazda.by/

E-mail: info@zvyazda.minsk.by

20.04.17

Лыскавец, Я. А на рабоце – дзіцячы садок… / Я. Лыскавец // Звязда. — 2017. — 20 красавіка (№ 75). — С. 1, 4. — (Дадатак “Чырвонка”).

Матэрыял артыкула знаёміць чытачоў з асаблівасцямі працы з самымі маленькімі дзецьмі Яўгеніі Барабаншчыкавай, настаўніцы фізічнай культуры ясляў-сада № 3 Смалявіч.

Электронная версія артыкула: *http://zviazda.by/be/news/20170419/1492615699-navoshta-pedagogu-navyki-artysta*

Казакевіч, Я. Моладзь – за новыя тэхналогіі / Я. Казакевіч // Звязда. — 2017. — 20 красавіка (№ 75). — С. 4. — (Дадатак “Чырвонка”).

Юныя праграмісты Маладзечанскага гандлёва-эканамічнага каледжа Дзмітрый Каспяровіч і Аляксандр Стэфановіч пад кіраўніцтвам выкладчыкаў Зоі Зянько, Марыі Манюк і Вольгі Цыганок распрацавалі спецыяльную мабільную праграму “Music GO” для смартфона або планшэта на платформе Android/IOS, якая дазволіць слухаць музыку за невялікую плату, прычым без выкарыстання інтэрнэт-трафіка. Сваё вынаходніцтва юнакі плануюць прадстаўляць не толькі на конкурс “100 ідэй для Беларусі”, але і на іншых значымых імпрэзах, звязаных з ІТ-тэхналогіямі.

Аўтар артыкула – вучаніца 10 класа СШ № 11 г. Маладзечна.

Электронная версія артыкула: *http://zviazda.by/be/news/20170419/1492616592-navuchency-maladzechanskaga-kaledzha-raspracavali-analag-srotifu*

Настаўніцкая газета» – выданне асветнікаўРэспублікі Беларусь.
Выдаецца з 20 снежня 1945 года. Выходзіць тры разы на тыдзень.
Заснавальнік: Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.
Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 77.
Web-сайт: http://nastgaz.by/
E-mail: info@nastgaz.by

22.04.17

Рэва, Д. Касмічны рынг / Д. Рэва // Настаўніцкая газета. — 2017. — 22 красавіка (№ 45). — С. 8.

Касмічны фестываль прайшоў у Чэрвеньскім раёне другі раз. Кульмінацыяй фестывалю стала яго конкурсная частка. Удзельнічалі ў ёй 11 каманд устаноў адукацыі раёна. Усіх іх гасцінна прымала гімназія № 1 імя У. А. Караля. Кожная каманда па выніках конкурсу атрымала дыплом за свае дасягненні на фестывалі. Абсалютнымі пераможцамі сталі каманды Запольскай сярэдняй школы і Любішанскага дзіцячага сада.

Электронная версія артыкула: *https://nastgaz.by/kasmichni-ring/*

Рэва, Д. Даследчык і мультыплікатар з трэцяга класа / Д. Рэва // Настаўніцкая газета. — 2017. — 22 красавіка (№ 45). — С. 8.

Работы вучаніцы 3 класа са Слуцка Святланы Крупскай атрымалі прызнанне журы на міжнародных мерапрыемствах. Так, мультфільм, створаны Святланай, атрымаў гран-пры Міжнароднага фестывалю дзіцячых кароткаметражных фільмаў GymCinFest – 1517, а даследчая работа дзяўчынкі ўзнагароджана дыпломам 1 ступені конкурсу навуковых даследаванняў і праектных работ SCIENTIA UNESCAMUS.

Макарэвіч, А. “Тамарына” школа / А. Макарэвіч // Настаўніцкая газета. — 2017. — 22 красавіка (№ 45). — С. 8.

Артыкул прысвечаны Тамаре Іванаўне Інфаровіч, дырэктару Лаўска-Бродскай сельскай школы, потым гімназіі, кавалеру ордэна “Знак пашаны”, выдатніку народнай адукацыі, настаўніку вышэйшай катэгорыі.

Грэчка, І. Самы дружалюбны горад / І. Грэчка // Настаўніцкая газета. — 2017. — 22 красавіка (№ 45). — С. 12. — (Дадатак “Шосты дзень”).

Падчас дзён моладзі Азербайджанскай Рэспублікі ў Рэспубліцы Беларусь адбылося падарожжа ў Нясвіж. Актыўнымі ўдзельнікамі такіх міжнародных мерапрыемстваў з’яўляюцца і педагогі, а таксама іх выхаванцы з сярэдняй школы № 3 і сярэдняй школы № 4 Нясвіжа.

20.04.17

Дубік, Н. Быць настаўнікам на выдатна / Н. Дубік // Настаўніцкая газета. — 2017. — 20 красавіка (№ 44). — С. 3.

Артыкул пра настаўніцу біялогіі сярэдняй школы № 1 Смалявіч Іну Яўгенаўну Янчыну, пра тое наколькі адукаванымі дзякуючы такім уласным метадам, як правядзенне доследаў і навукова-даследчых работ, сталі дзеці, як працаваць з адоранымі навучэнцамі і ці варта прыцягваць школьнікаў да ўдзелу ў навуковай рабоце.

18.04.17

Рэва, Д. Ключ ад краіны дзяцінства / Д. Рэва // Настаўніцкая газета. — 2017. — 18 красавіка (№ 43). — С. 3.

У вёсцы Копішча адкрылася новая дашкольная ўстанова. Дзіцячы сад разлічаны на 12 груп, у якіх могуць займацца 230 маленькіх выхаванцаў.

Электронная версія артыкула: https://nastgaz.by/klyuch-ad-kraini-dzyacinstva/

Гомза, В. На “адной хвалі” з навучэнцамі / В. Гомза // Настаўніцкая газета. — 2017. — 18 красавіка (№ 43). — С. 6.

6-7 красавіка 2017 г. на базе сярэдняй школы № 14 Маладзечна прайшоў семінар-практыкум “Сучасныя формы і метады ідэалагічнага выхавання навучэнцаў”, арганізатарам якога стала Акадэмія паслядыпломнай адукацыі. Галоўная мэта мерапрыемства – удасканаленне ідэалагічнай і выхаваўчай работы ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі. Намеснікі дырэктараў па выхаваўчай рабоце ўстаноў сярэдняй адукацыі краіны знаёміліся з вопытам работы Мінскай вобласці на прыкладзе маладзечанскай школы № 14 і гімназіі-каледжа мастацтваў.

15.04.17

Кулікоўская, А. Да любімай справы – з энергіяй і натхненнем / А. Кулікоўская // Настаўніцкая газета. — 2017. — 15 красавіка (№ 42). — С. 1.

Артыкул прысвечаны настаўніку англійскай мовы гімназіі № 1 Дзяржынска Аксане Антонаўне Вайцяхоўскай.

Рэва, Д. Крышталёвая сініца ў руках / Д. Рэва // Настаўніцкая газета. — 2017. — 15 красавіка (№ 42). — С. 7.

У Мінскім абласным інстытуце развіцця адукацыі адбыўся фінал абласнога этапу конкурсу прафесійнага майстэрства “Настаўнік года Рэспублікі Беларусь”.

Па ітогам конкурсу пераможцамі і лаўрэатамі сталі наступныя ўдзельнікі. У намінацыі “Руская мова і літаратура, беларуская мова і літаратура” перамагла Таццяна Аляксандраўна Кавалёнак, настаўніца крупскай сярэдняй школы № 1 імя В.М. Марцінкевіча.

Лідарам у намінацыі “Замежная мова” стала Кацярына Мікалаеўна Івашанка, намеснік дырэктара па вучэбнай рабоце, настаўніца французскай мовы гімназіі № 3 Маладзечна.

Таццяна Лявонаўна Апановіч, якая працуе ў яслях-садзе № 24 Маладзечна, стала пераможцай у намінацыі "Выхавальнік дашкольнай адукацыі".

Перамогу ў адпаведнай намінацыі святкавала настаўніца пачатковых класаў сярэдняй школы № 6 Жодзіна Таццяна Аляксандраўна Новікава.

Уладзімір Генадзьевіч Тылецкі, настаўнік Гатаўскай сярэдняй школы Мінскага раёна, прызнаны лідарам у намінацыі "Гісторыя, грамадазнаўства, геаграфія".

Сярод настаўнікаў фізікі, астраноміі, матэматыкі, інфарматыкі лепшым журы назвала Максіма Віктаравіча Дубіну, які працуе ў сярэдняй школе № 1 Фаніпаля.

Ірына Леанідаўна Сярко, настаўніца біялогіі Астрашыцка-Гарадоцкай сярэдняй школы Мінскага раёна, – пераможца ў намінацыі "Хімія, біялогія".

Алена Леанідаўна Сасноўская, настаўніца фізічнай культуры і здароўя сярэдняй школы № 11 Слуцка, стала лепшай у намінацыі "Музыка, выяўленчае мастацтва, мастацтва, працоўнае навучанне, чарчэнне, фізічная культура і здароўе, дапрызыўная падрыхтоўка".

Рэва, Д. Школьны музей касманаўтыкі / Д. Рэва // Настаўніцкая газета. — 2017. — 15 красавіка (№ 42). — С. 7.

У чэрвеньскай сярэдняй школе № 2 імя А.К. Флегантава дзейнічае музей касманаўтыкі.

Рэва, Д. Царыца навук запрасіла на турнір / Д. Рэва // Настаўніцкая газета. — 2017. — 15 красавіка (№ 42). — С. 7.

Юныя аматары царыцы навук сталі ўдзельнікамі V Абласнога міні-турніру юных матэматыкаў. Мерапрыемства прайшло ў Дзяржынскім раёне на базе сярэдняй школы № 1 Фаніпаля. У выніку матэматычных баёў пераможцамі сталі зборныя каманды Барысаўскага і Нясвіжскага раёнаў.

Калядзіч, Н. Расправіць крылы і ўзляцець да зорак / Н. Калядзіч // Настаўніцкая газета. — 2017. — 15 красавіка (№ 42). — С. 10.

Напярэдадні свайго 10-гадовага юбілею члены клуба "Крыштальны журавель" правялі рэспубліканскі семінар-акцыю "Настаўнік года " – Цэнтральнаму раёну Мінска", які адбыўся ў сценах сталічнай гімназіі № 24. Праграма семінара-акцыі ўключала адкрытыя ўрокі па вучэбных прадметах, у якіх прыняў удзел Віктар Эдуардавіч Жук. Ён правёў урок па гісторыі Беларусі ў 9 класе на тэму "Прамысловае развіццё і стан гарадоў, развіццё гандлю, фінансаў, транспарту ў 60-х гг. XIX – пачатку XX стагоддзя."

Дубоўская, В. У атмасферы сяброўства і адчуванні пляча / В. Дубоўская // Настаўніцкая газета. — 2017. — 15 красавіка (№ 42). — С. 11.

Свой юбілей члены клуба "Крыштальны журавель" адзначалі ў актыўным дзеянні. Падчас правядзення майстар-класаў настаўнік-метадыст, настаўнік фізічнай культуры сярэдняй школы імя С.Ф. Рубанава № 10 Слуцка Валерый

КРАСАВІК

Варанцоў падбадзёрыў калег фізкультхвілінкай. Настаўнікі-метадысты Іван Якіменка, Вольга Кіслова, Святлана Германовіч – настаўнікі матэматыкі Лошніцкай гімназіі падзяліліся з калегамі ўласным вопытам па кантролі засваення матэрыялу ўрока.

13.04.17

Клюйко, А. Тахеометр па вымярэнні прафесіяналізму / А. Клюйко // Настаўніцкая газета. — 2017. — 13 красавіка (№ 41). — С. 5.

У выніку конкурсу, які адбыўся ў Гомельскім дарожна-будаўнічым каледжы, філіяле Рэспубліканскага інстытута прафесійнай адукацыі падчас адборачных спаборніцтваў за гонар стаць членам нацыянальнай каманды WorldSkills International, "бронзу" ў новай кампетэнцыі "Геадэзія" заваявалі Максім Гадлеўскі і Яўген Гарэльчык з філіяла БНТУ "Барысаўскі політэхнічны каледж". Навучэнцы разам з іншымі пераможцамі сталі членамі нацыянальнай зборнай і паедуць на фінал V Нацыянальнага чэмпіянату Расійскай Федэрацыі "Маладыя прафесіяналы" – WorldSkills Russia, які адбудзецца ў майскія дні ў Краснадары.

Электронная версія артыкула: *https://nastgaz.by/taheometr-pa-vimyarenni-prafesiyanalizmu/*

Рэва, Д. Адвечны пошук краязнаўцаў / Д. Рэва // Настаўніцкая газета. — 2017. — 13 красавіка (№ 41). — С. 8.

У Слуцку прайшоў рэспубліканскі краязнаўчы форум педагагічных работнікаў "Школьнае краязнаўства на сучасным этапе: пераемнасць традыцый і дасягненні".

Падчас форуму навучэнцы ўстаноў адукацыі раёна падрыхтавалі выставу, дзе расказалі аб праектнай, клубнай, музейнай, навукова-даследчай дзейнасці. Так, вучні гімназіі № 1 Слуцка прэзентавалі шэраг даследчых работ, прысвечаных тэме "Слуцкі след у космасе". Выклікалі зацікаўленасць прэзентацыі турысцка-краязнаўчых клубаў "Пошук" Паўстынскай сярэдняй школы і "Пегас" Слуцкага цэнтра турызму, а таксама клуба гістарычнай рэканструкцыі ваеннай тэхнікі Слуцкага цэнтра тэхнічнай і прыкладной творчасці навучэнскай моладзі.

Электронная версія артыкула: *https://nastgaz.by/advechni-poshuk-krayaznaucau/*

08.04.17

Бондарава, Т. Творцы будучыні / Т. Бондарава // Настаўніцкая газета. — 2017. — 8 красавіка (№ 39). — С. 6.

У Полацку адбыўся заключны этап Рэспубліканскай алімпіяды па вучэбных прадметах "Руская мова" і "Руская літаратура".

Спецыяльным прызам міністра адукацыі Рэспублікі Беларусь за выдатнае веданне рускай літаратуры ўзнагароджаны навучэнец 8 класа сярэдняй школы № 3 Стоўбцаў Дзмітрый Суднік.

Рэва, Д. Іспыт ведаў і іх трываласці / Д. Рэва // Настаўніцкая газета. — 2017. — 8 красавіка (№ 39). — С. 7.

КРАСАВІК

Лепшыя знаўцы гісторыі і грамадазнаўства ўдзельнічалі ў заключным этапе алімпіяды, якая праходзіла на базе Барысаўскага дзяржаўнага каледжа.

Усяго юным гісторыкам было ўручана 34 дыпломы, сярод іх 4 дыплома прысуджаны Мінскай вобласці.

Лойка, Н. Суботнік па-піянерску / Н. Лойка // Настаўніцкая газета. — 2017. — 8 красавіка (№ 39). — С. 15.

Беларуская рэспубліканская піянерская арганізацыя правяла агульнапіянерскі суботнік, прысвечаны 95-годдзю піянерскага руху. Больш за 400 тысяч піянераў па ўсёй краіне ўзялі ўдзел у мерапрыемстве.

На Міншчыне асноўнае мерапрыемства суботніка адбылося на гасціннай чэрвеньскай зямлі, у піянерскай дружыне "Беларусачка" Запольскай сярэдняй школы.

Шыпценка, Ю. Родны наш край: з любоўю і ведамі пра яго! / Ю. Шыпценка // Настаўніцкая газета. — 2017. — 8 красавіка (№ 39). — С. 15.

Артыкул намесніка загадчыка па асноўнай дзейнасці ясляў-сада № 2 Дзяржынска прысвечаны дзейнасці выхавальнікаў установы па рэалізацыі педагагічнага праекта "Укараненне мадэлі маральна-патрыятычнага выхавання дзяцей старэйшага дашкольнага ўзросту з дапамогай далучэння да гісторыіі і культуры Дзяржыншчыны".

Дубоўская, В. Да новых вымярэнняў у педагагічнай творчасці / В. Дубоўская, Н. Калядзіч // Настаўніцкая газета. — 2017. — 8 красавіка (№ 39). — С. 18–19.

9 красавіка клубу "Крыштальны журавель" споўнілася 10 гадоў. Да віншаванняў далучыўся Віктар Эдуардавіч Жук, настаўнік гісторыі і грамадазнаўства сярэдняй школы № 11 Маладзечна, член клуба.

Электронная версія артыкула: *https://nastgaz.by/da-novih-vimyarennyau-u-pedagagichnai-tvorchasci/*

Пыркова, М. Урок прафарыентацыі… у падарожжы! / Т. Бондарава // Настаўніцкая газета. — 2017. — 8 красавіка (№ 39). — С. 20–21.

Падчас вясновых канікул філіял кафедры педагогікі БДПУ імя Максіма Танка прапанаваў матываваным выпускнікам устаноў агульнай сярэдняй адукацыі яшчэ адну форму прафарыентацыйнай работы з вучнямі педагагічных класаў – вучэбна-адукацыйнае падарожжа.

З 27 па 30 сакавіка ў вучэбна-адукацыйным падарожжы па маршруце Дрэздэн-Прага-Варшава прынялі ўдзел старшакласнікі вілейскай гімназіі № 2, якія плануюць паступаць у Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка.

Электронная версія артыкула: *https://nastgaz.by/urok-prafarientacii-u-padarojji/*

06.04.17

Рэва, Д. Энергія творчасці будуюць будучыню / Д. Рэва // Настаўніцкая газета. — 2017. — 6 красавіка (№ 38). — С. 1.

У Маладзечне сёлета быў дадзены старт абласному этапу фестывалю "Арт-вакацыі-2017", у якім удзельнічалі лепшыя калектывы Міншчыны, навучэнцы сістэмы прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі.

На фестывалі была прадстаўлена распрацоўка Вольгі Раманаўны Дамацкай, педагога-арганізатара Капыльскага дзяржаўнага каледжа, – святочная праграма, прысвечаная Дню настаўніка, што праводзіцца ў форме тэлешоў. Цікавы праект прэзентаваў Маладзечанскі дзяржаўны музычны каледж імя М.К. Агінскага – тэатралізаванае прадстаўленне "Маладзёжны шляхецкі баль".

На інтэрактыўных пляцоўках з танцавальнымі нумарамі выступілі агітбрыгады Слуцкага дзяржаўнага каледжа, Барысаўскага дзяржаўнага будаўнічага ліцэя і навучэнцы Слуцкага дзяржаўнага сельскагаспадарчага прафесійнага ліцэя. Хлопцы і дзяўчаты з Капыльскага дзяржаўнага каледжа запрасілі наведаць 3D-прастору і арганізавалі заняткі па цімбілдынгу. Маладзечанскі дзяржаўны каледж ладзіў моднае дэфіле, а Нясвіжскі дзяржаўны каледж імя Якуба Коласа прапанаваў паўдзельнічаць у электроннай гульні-віктарыне "Коласазнаўцы". Навучэнцы Мар'інагорскага дзяржаўнага аграрна-тэхнічнага каледжа запрашалі павучыцца ствараць шыкоўныя ўпрыгожванні са скуры, а хлопцы і дзяўчаты з Барысаўскага дзяржаўнага каледжа прапанавалі паспрабаваць сябе ў акварэльным жывапісе шэрсцю.

Таксама дзейнічалі разнастайныя майстар-класы, тэатр моды "Вільяначка" Вілейскага дзяржаўнага каледжа.

Працягам мерапрыемства стала канцэртная праграма, у якой прынялі ўдзел калектывы Нясвіжскага дзяржаўнага каледжа імя Якуба Коласа, Смілавіцкага дзяржаўнага каледжа, Клецкага сельскагаспадарчага прафесійнага ліцэя, гімназіі-каледжа мастацтваў Маладзечна, Барысаўскага дзяржаўнага каледжа, Слуцкага дзяржаўнага медыцынскага каледжа, Навапольскага дзяржаўнага аграрна-эканамічнага каледжа.

Сёлета абласны этап фестывалю на Міншчыне рыхтавала цалкам новая каманда арганізатараў – супрацоўнікі цэнтра выхаваўчай работы Мінскага абласнога ІРА.

Вашкелевіч, Н. Шлях у навуку пачынаецца ў Год навукі / Н. Вашкелевіч // Настаўніцкая газета. — 2017. — 6 красавіка (№ 38). — С. 4.

Гродзенская вобласць прымала ўдзельнікаў заключнага этапу Рэспубліканскай алімпіяды па чатырох вучэбных прадметах – "Матэматыка", "Інфарматыка", "Фізіка" і "Астраномія".

Дыпломамі 1 ступені заключнага этапу Рэспубліканскай алімпіяды па матэматыцы адзначаны Вадзім Хмара (гімназія Дзяржынска). Прыз міністра адукацыі атрымаў вучань 9 класа гімназіі № 1 Барысава Яўген Дзядкоў, які выступаў за 10 клас і паказаў самы высокі вынік. Дыпломам 1 ступені заключнага этапу Рэспубліканскай алімпіяды па фізіцы адзначаны навучэнцы 9 класа Раман

Кірычэнкаў (Гатаўская сярэдняя школа Мінскага раёна), Ілья Драпеза (гімназія № 1 Барысава) і Яўген Дзядкоў (гімназія № 1 Барысава).

Рэва, Д. Усё пачынаецца з любові / Д. Рэва // Настаўніцкая газета. — 2017. — 6 красавіка (№ 38). — С. 14.

Сёлета Чалавекам года Міншчыны стала настаўніца рускай мовы і літаратуры Крупскай раённай гімназіі Святлана Леанідаўна Хадатовіч. У артыкулу змешчаны матэрыял аб педагагічнай дзейнасці настаўніцы.

Рэва, Д. Аб'яднаныя ведамі / Д. Рэва // Настаўніцкая газета. — 2017. — 6 красавіка (№ 38). — С. 14.

Софія Палюта, вучаніца 4 класа Нясвіжскай гімназіі, атрымала дыплом 2 ступені маскоўскай VI навукова-практычнай канферэнцыі "Аб'ядноўваемся ведамі", якая прадставіла сваё даследаванне "Матэматычная мова прыгажосці" (кіраўнік настаўніца Святлана Вітальеўна Прасмыцкая).

Рэва, Д. Гагарынскія чытанні / Д. Рэва // Настаўніцкая газета. — 2017. — 6 красавіка (№ 38). — С. 14.

Удзельнікамі Гагарынскіх чытанняў навучэнцы ўстаноў адукацыі Міншчыны становяцца штогод і заўсёды вяртаюцца дамоў з узнагародамі. Сёлета яны паспяхова прадставілі свае працы ў дзвюх секцыях: "Касманаўтыка і моладзь" і "Гісторыя ракетна-касмічнай тэхнікі і пілатуемай касманаўтыкі".

Па выніках мерапрыемства дыпломамі Цэнтра падрыхтоўкі касманаўтаў узнагароджаны Валянціна Сігаева (віртуальная экскурсія "Ён сказаў "Паехалі!" пад кіраўніцтвам настаўніцы Л.У. Кацько), навучэнка сярэдняй школы № 3 Чэрвеня, Дзмітрый Макарыч, навучэнец гімназіі № 1 Слуцка (работа "Каб аб космасе марыць, аб Сусвеце трэба ведаць!" пад кіраўніцтвам настаўніцы Т.Я. Максіменка), і Мікіта Рогаў, навучэнец Крупскай раённай гімназіі (работа "У космас у XVII стагоддзі?" пад кіраўніцтвам педагога М.М. Рогава).

Кірыл Ліпскі і Дзяніс Барысевіч, навучэнцы Смалявіцкай раённай гімназіі, былі ўзнагароджаны дыпломамі аргкамітэта за работу "Прыборы для касмічных даследаванняў, распрацаваныя ў Беларусі" пад кіраўніцтвам В.Я. Лявончанка.

Удзельнікі чытанняў атрымалі цудоўны падарунак. Так, дзяцей са Слуцка і Чэрвеня запрасілі прадставіць свае работы падчас летняй змены Міжнароднай аэракасмічнай школы ва Уфе і на навуковых чытаннях памяці К.Э. Цыялкоўскага ў Калузе.

Белановіч, Т. Школьны парад навук / Т. Белановіч // Настаўніцкая газета. — 2017. — 6 красавіка (№ 38). — С. 14.

Аўтар артыкула намеснік дырэктара па вучэбнай рабоце Вішнявецкай сярэдняй школы Стаўбцоўскага раёна знаёміць чытачоў з рэлізацыяй педагагічным калектывам установы задачы па выяўленні і развіцці здольнасцей у школьнікаў праз розныя формы работы на ўроках і пазаўрочнай дзейнасці.

04.04.17

Сінькевіч, Г. Паказалі бліскучыя веды / Г. Сінькевіч // Настаўніцкая газета. — 2017. — 4 красавіка (№ 37). — С. 2.

У Магілёве прайшоў заключны этап рэспубліканскіх алімпіяд па замежных мовах. Спаборніцтвы праводзіліся па англійскай, нямецкай, французскай, іспанскай і кітайскай мовах. Свае веды дэманстравалі звыш 200 разумнікаў і разумніц з усіх рэгіёнаў краіны.

Сярод абсалютных пераможцаў і ўладальнікаў дыпломаў 1 ступені стала вучаніца гімназіі № 1 Дзяржынска Марыя Клокава. Самыя трывалыя веды па нямецкай мове прадэманстравала і вучаніца гімназіі № 10 Маладзечна Ганна Скрыпко.

Грэчка, І. Пытанне 15 метраў, або Перспектывы развіцця скалалажання / І. Грэчка // Настаўніцкая газета. — 2017. — 4 красавіка (№ 37). — С. 8.

Кожны год у нашай краіне адкрываюцца скаладромы, сотні хлопчыкаў і дзяўчынак запісваюцца ў адпаведныя аб'яднанні па інтарэсах, якія дзейнічаюць пераважна пры ўстановах дадатковай адукацыі турыстычна-краязнаўчага профілю. Але ў некаторых рэгіёнах наспела патрэба ствараць дзіцяча-юнацкія спартыўныя школы па скалажанні. Для прыкладу – гэта Мар'іна Горка і шмат іншых гарадоў.

Электронная версія артыкула: *https://nastgaz.by/pitanne-15-metrau/*

01.04.17

Клюйко, А. Майстра малочнай вытворчасці рыхтуем разам / А. Клюко // Настаўніцкая газета. — 2017. — 1 красавіка (№ 36). — С. 5.

Напярэдадні Дня яднання народаў Беларусі і Расіі ў Слуцкім дзяржаўным каледжы прайшоў міжнародны конкурс прафесійнага майстэрства, дзе выхаванцы гэтай установы спаборнічалі са сваімі равеснікамі з расійскага тэхналагічнага каледжа горада Савецкага Калінінградскай вобласці па кампетэнцыі "Майстар малочнай вытворчасці".

Першая месца заваявала Аліна Кананоўіч са Слуцкага дзяржаўнага каледжа, якая была першая ў тэарэтычным і практычным туры спаборніцтва.

Рэва, Д. Уладары пяра / Д. Рэва // Настаўніцкая газета. — 2017. — 1 красавіка (№ 36). — С. 8.

У Слуцку вызначылі лепшых юных журналістаў падчас правядзення раённага конкурсу "Уладар пяра". Конкурс арганізаваны ў рамках ініцыятывы "Горад, дружалюбны да дзяцей". Урачыстая цырымонія ўзнагароджання пераможцаў адбылася ў Слуцкім цэнтры дзіцячай творчасці.

У першай намінацыі – "Друкаваныя СМІ" – дыпломам 1 ступені ўзнагароджаны рэдакцыйны савет гімназіі № 1 Слуцка. Дыпломам 2 ступені ўзнагароджаны калектыў сярэдняй школы № 13, 3 ступені – калектыў сярэдняй школы № 12.

КРАСАВІК

У другой намінацыі – "Лепшая публікацыя юных карэспандэнтаў у "дарослых" СМІ" – дыпломам 1 ступені адзначаны навучэнцы сярэдняй школы № 4 Аліна Ліс, Алена Базылевіч і Валерыя Грышкавец, а таксама навучэнцы сярэдняй школы № 11 Вадзім Толкач і Святлана Іваньшына.

Рэва, Д. Прафарыентацыйныя даследаванні школьнікаў / Д. Рэва // Настаўніцкая газета. — 2017. — 1 красавіка (№ 36). — С. 8.

У Крупках прайшоў фестываль даследчых работ прафарыентацыйнай накіраванасці "Асоба і прафесія". Па выніках выступленняў журы прысудзіла гран-пры фестывалю стваральнікам 8 работ.

Уладальнікамі награды сталі Яна Швед, навучэнка Ухвальскага дзіцячага сада – сярэдняй школы імя А.С. Лукашэвіча, з работай "Настаўнік – гэта прызванне ці стан душы…"; Хрысціна Драгун, навучэнка Крупскай раённай гімназіі, з даследаваннем "Настаўнік – прафесія далёкага дзеяння, галоўная на Зямлі"; Таццяна Алексяёнак, вучаніца Хацюхоўскага дзіцячага сада – сярэдняй школы імя У.В. Кавалёнка, якая вывучала якасці сапраўднага настаўніка; і Аляксандра Смірнягіна, навучэнка сярэдняй школы № 1 імя У.Н. Марцінкевіча Крупак, з работай "Прафесія настаўніка: учора, сёння, заўтра".

Аб прафесіях сваіх родных расказалі ўладальнікі гран-пры, навучэнцы Худавецкага ясляў-сада – сярэдняй школы Крупскага раёна Раман Бараноўскі і Яна Рабчынская, а таксама навучэнка Крупскай раённай гімназіі Лізавета Ціханавецкая.

Таксама ўзнагароды фестывалю атрымалі школьнікі, якія даследавалі прафесію, якую ўжо выбралі для сябе: Ангеліна Белая, навучэнка Нацкай сярэдняй школы імя М.Д. Шастакова Крупскага раёна і Ксенія Ляшкова, якая вучыцца ў Коласаўскай сярэдняй школе Крупскага раёна.

Электронная версія артыкула: *https://nastgaz.by/prafarientaciiniya-dasledavanni-shkolnikau/*

Рэва, Д. Проста аб складаным / Д. Рэва // Настаўніцкая газета. — 2017. — 1 красавіка (№ 36). — С. 8.

Серыю вэбінараў "Камунікатыўная граматыка" праводзяць для юных аматараў замежнай мовы спецыялісты Мінскага абласнога ІРА. Заняткі для навучэнцаў 8-9 класаў праходзяць два разы на тыдзень, курс разлічаны на 48 гадзін. Як адзначыла Наталля Казіміраўна Радзевіч, начальнік вучэбна-метадычнага аддзела замежных моў МАІРА, такія заняткі можна лічыць эфектыўнай формай дапрофільнай падрыхтоўкі, а таксама яны цікавыя высокаматываваным навучэнцам, якія настройваюцца на выніковы ўдзел у Рэспубліканскай алімпіядзе па вучэбным прадмеце "Замежная мова".

Чыжова, А. Тыдзень англійскай мовы: добрыя веды і добрыя справы / А. Чыжова // Настаўніцкая газета. — 2017. — 1 красавіка (№ 36). — С. 8.

Настаўніца англійскай мовы сярэдняй школы № 2 Салігорска Алена Чыжова дзеліцца з чытачамі вопытам правядзення мерапрыемстваў тыдня англійскай мовы.

«Мінская праўда» – абласная грамадска-палітычная газета.

Заснавана 1 лістапада 1950 года. Выходзіць тры разы на тыдзень.

Заснавальнікі: Мінскі абласны выканаўчы камітэт, Мінскі абласны Савет дэпутатаў, калектыў Мінскага абласнога ўнітарнага прадпрыемства «Рэдакцыя газеты «Мінская праўда».

Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

Web-сайт: http://www.mpravda.by

E-mail: info@minpraud.by

19.04.17

Читать номер в формате PDF: *http://mpravda.by/pdf-arkhiv/item/10036-minskaya-praŭda-№29-14863-ot-19042017.html*

Молодежь! Профессиональный выбор за вами! // Мінская праўда. — 2017. — 19 красавіка (№ 29). — С. 15.

В рубрике "Твоя будущая профессия" размещена информация об учреждении образования "Смолевичский государственный аграрно-технический профессиональный лицей".

15.04.17

Читать номер в формате PDF: *http://mpravda.by/pdf-arkhiv/item/9990-minskaya-praŭda-№28-14862-ot-15042017.html*

Цвірко, В. Дзяцінства па суседству / В. Цвірко // Мінская праўда. — 2017. — 15 красавіка (№ 28). — С. 5.

Дванаццать груп дзяцей узростам ад 2 да 6 год будзе сфарміравана ў новым садку, што адкрыўся ў вёсцы Копішча Мінскага раёна.

Дзве ўстановы дашкольнай адукацыі будуюцца ў Жодзіне і Стоўбцах. Іх плануецца здаць да 1 верасня.

У бліжэйшы час плануецца прыступіць да будаўніцтва дашкольных устаноў у Бараўлянах і Фаніпалі.

Сурма, К. Дзе Колас чытаў паэму, а Косберг асвойваў фізіку / К. Сурма // Мінская праўда. — 2017. — 15 красавіка (№ 28). — С. 14. — (Дадатак "МП плюс").

Артыкул прысвечаны гімназіі № 1 Слуцка.

12.04.17

Читать номер в формате PDF: *http://mpravda.by/pdf-arkhiv/item/9951-minskaya-praŭda-№27-14861-ot-12042017.html*

Малашенков, В. Без работы не останутся / В. Малашенков // Мінская праўда. — 2017. — 12 красавіка (№ 27). — С. 13.

В рубрике "Твая будучая прафесія" размещен материал о ГУО «Березинский аграрно-технический профессиональный лицей».

Кучинская, А. Выбор, интегрированный в жизнь / А. Кучинская // Мінская праўда. — 2017. — 12 красавіка (№ 27). — С. 13.

В рубрике "Твая будучая прафесія" – материал о ГУО «Смиловичский сельскохозяйственный профессиональный лицей».

Гавриленко, Ю. Специальности, которые всегда востребованы / Ю. Гавриленко // Мінская праўда. — 2017. — 12 красавіка (№ 27). — С. 14.

Рубрика "Твая будучая прафесія" знакомит читателей с ГУО «Воложинский сельскохозяйственный профессиональный лицей».

Ивашко, Е. Мастера на все руки / Е. Ивашко // Мінская праўда. — 2017. — 12 красавіка (№ 27). — С. 14.

ГУО «Жодинский профессиональный лицей» объявляет прием учащихся.

08.04.17

Читать номер в формате PDF: *http://mpravda.by/pdf-arkhiv/item/9905-minskaya-praŭda-№26-14860-ot-08042017.html*

Брожина, Ю. Громкий успех / Ю. Брожина // Мінская праўда. — 2017. — 8 красавіка (№ 26). — С. 3.

Команда Минской области побила предыдущий рекорд по количеству завоеванных дипломов на республиканской олимпиаде по учебным предметам. На заключительном этапе учащиеся завоевали 82 диплома по 16 предметам, в том числе 9 – первой степени, 20 – второй и 53 – третьей, а также получили 10 похвальных отзывов. Это на 19 наград больше, чем годом ранее.

Учитель физики гимназии № 1 Борисова Евгений Волынец считается одним из лучших педагогов Минской области. В этом году на заключительный этап республиканской олимпиады поехали четверо его учеников, и все вернулись с наградами. Евгений Дедков, подопечный педагога, стал абсолютным победителем республиканской олимпиады.

11-классник Долгиновской средней школы Вилейского района Денис Яскевич завоевал диплом 3 степени (учитель физики Владимир Леонтьевич Малашевич).

И фолк, и классика, и джаз звучали в Жодино / «Жодзінскія навіны» // Мінская праўда. — 2017. — 8 красавіка (№ 26). — С. 4.

Ярким событием стал областной конкурс творческих работ учителей детских школ искусств памяти Анатолия Новикова.

Раскажам сказку разам / "Пухавіцкія навіны", Мар'іна Горка // Мінская праўда. — 2017. — 8 красавіка (№ 26). — С. 4.

КРАСАВІК

Выхавальнік Ірына Волчанка і музычны кіраўнік Людміла Антонава цэнтра дашкольнага развіцця дзіцяці рэалізавалі сумеснае выступленне сваіх выхаванцаў і іх бацькоў, дзякуючы новаму музычна-тэатральнаму праекту.

Максимова, К. Территория творчества и успеха / К. Максимова // Мінская праўда. — 2017. — 8 красавіка (№ 26). — С. 8.

Последние 11 лет отдел образования, спорта и туризма Дзержинского райисполкома занимает первое место в областном конкурсе «За достижение высоких показателей в развитии образования». В лидерах – 6 учреждений: Негорельская средняя школа № 1, Детский центр развития ребенка п. Энергетиков, Центр творчества детей и молодежи Дзержинского района, Детский центр развития ребенка г. Дзержинска, гимназия г. Дзержинска, средняя школа № 1 г. Фаниполя.

Немалый вклад в достижение высоких результатов вносят педагоги. Это учителя истории и английского языка гимназии № 1 г. Дзержинска Н. Шамко и О. Вайтеховская; учитель математики гимназии г. Дзержинска Е. Караневич; учитель начальных классов гимназии г. Фаниполя И. Бобровская; учитель трудового обучения средней школы № 2 г. Дзержинска Н. Кардаш; учитель информатики средней школы № 4 г. Дзержинска С. Пузиновская; воспитатель дошкольного образования яслей-сада № 5 г. Дзержинска Т. Канецкая; воспитатель дошкольного образования Станьковского яслей-сада № 1 О. Семенова и др.

Малашенков, В. В джазе только девочки / В. Малашенков // Мінская праўда. — 2017. — 8 красавіка (№ 26). — С. 12.

Семилетняя ученица солигорской средней школы № 6 Соня Курлович в прошлом году стала лучшей на конкурсе "Талент краіны". На днях вернулась из Москвы с XVII международного джазового фестиваля Игоря Бутмана «Триумф джаза», а летом поедет к знаменитому кинорежиссеру Эмиру Кустурице в Сербию.

05.04.17

Читать номер в формате PDF: *http://mpravda.by/pdf-arkhiv/item/9892-minskaya-praўda-№25-14859-ot-05042017.html*

Брожина, Ю. На кого пойти учиться? / Ю. Брожина // Мінская праўда. — 2017. — 5 красавіка (№ 25). — С. 15.

Заметка о Клецком сельскохозяйственном профессиональном лицее.

01.04.17

Читать номер в формате PDF: *http://mpravda.by/pdf-arkhiv/item/9813-minskaya-praўda-№24-14858-ot-01042017.html*

Брожина, Ю. Пока что синица в руках / Ю. Брожина // Мінская праўда. — 2017. — 1 красавіка (№ 24). — С. 10.

В Дзержинске выбрали 8 лучших педагогов Минской области. В сентябре они представят центральный регион на республиканском конкурсе "Учитель года". Победители в номинациях:

“Физика, астрономия, математика, информатика” – учитель физики средней школы № 1 г. Фаниполя Дзержинского района Максим Дубина;

«Иностранный язык» – заместитель директора по учебной работе, учитель французского языка гимназии № 3 г. Молодечно Екатерина Ивашенко;

«Русский язык и литература, белорусский язык и литература» – учитель русского языка и литературы средней школы № 1 им. В.Н. Марцинкевича г. Крупки Татьяна Коноваленок;

«Начальные классы» – учитель начальных классов средней школы № 6 г. Жодино Татьяна Новикова;

«Музыка, изобразительное искусство, искусство (отечественная и мировая художественная культура), трудовое обучение, черчение, физическая культура и здоровье, допризывная подготовка» – учитель физической культуры и здоровья средней школы № 11 г. Слуцка Елена Сосновская;

«История, обществоведение, география» – учитель истории Гатовской средней школы Минского района Владимир Тылецкий;

«Химия, биология» – учитель биологии Острошицко-Городокской средней школы Минского района Ирина Серко;

«Воспитатель дошкольного образования» – воспитатель дошкольного образования яслей-сада № 24 г. Молодечно Татьяна Апанович.

Сліж, М. “Гісторыя – гэта вялікія граблі чалавецтва / М. Сліж // Мінская праўда. — 2017. — 1 красавіка (№ 24). — С. 11.

Артыкул прысвечаны Віктару Эдуардавічу Жуку, настаўніку сярэдняй школы № 11 г. Маладзечна, пераможцу Рэспубліканскага конкурсу прафесійнага майстэрства педагагічных работнікаў “Настаўнік года Рэспублікі Беларусь – 2014”.

Солонец, Г. Столбцовская спортармия / Г. Солонец // Мінская праўда. — 2017. — 1 красавіка (№ 24). — С. 21.

В рейтинге детско-юношеских спортивных школ области Столбцовская ДЮСШ входит в пятерку лучших. Новый руководитель Роман Валерьевич Кузнецов с гордостью рассказывает о спортивной школе.